УДК 325.2:34(476=71)

**В. У. Коваль**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# ПРАВАВЫЯ АСПЕКТЫ ЭМІГРАЦЫІ БЕЛАРУСАЎ У КАНАДУ (1921–1939 ГГ.)

У даследаванні вывучаны юрыдычныя аспекты станаўлення і развіцця эміграцыйнай хвалі з тэрыторыі Заходняй Беларусі ў Канаду. Прааналізаваны маштабы беларускай эміграцыі ў Канаду за міжваенны перыяд, калі Заходняя Беларусь была часткай Польшчы. У артыкуле разгледжаны польскія эміграцыйныя дзяржаўныя органы, якія стымулявалі міжкантынентальную эміграцыю з мэтай эфектыўнай паланізацыі беларускага насельніцтва. У 1926 г. былі падпісаны канадска-польскія «чыгуначныя пагадненні», якія пашыралі магчымасці рэкрутацыі з тэрыторыі Польшчы. Адборам эмігрантаў у Польшчы займаліся чыгуначныя кампаніі «Canadian National Railways» і «Canadian Pacific Railways» на аснове нарматыўных міжурадавых дакументаў. Значная ўвага ў даследаванні нададзена пытанням эміграцыйнай палітыкі Канады, якая перыядычна прыпыняла дзеянне «чыгуначных пагадненняў», што абмяжоўвала магчымасці перасялення ў дамініён.

**Ключавыя словы:** беларуская эміграцыя, беларуская дыяспара, Канада, прававая адаптацыя, польская эміграцыйная палітыка.

**Для цытавання:** Коваль В. У. Прававыя аспекты эміграцыі беларусаў у Канаду (1921–1939 гг.) // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2023. № 1 (269). С. 91–94. DOI: 10.52065/2520-6885-2023-269-1-16.

**V. U. Koval**
Belarusian State Technological University

# LEGAL ASPECTS OF THE BELARUSIAN EMIGRATION TO CANADA (1921–1939)

This article examines the legal aspects of the formation the development of the emigration wave from Western Belarus to Canada. The intensity of the Belarusian emigration to Canada during the interwar period was analyzed, when the territory of Western Belarus was a part of Poland. The article presents the police of the Polish emigration authorities, which stimulated the intercontinental Belarusian emigration for the effectual polonization of the Belarusian population. The Canadian-Polish «railway agreements» were sign in 1926. According to the agreements, the possibilities for recruiting emigrants from Poland were expanded. The recruitment of emigrants in Poland was carried out by the Canadian railway companies «Canadian National Railways» and «Canadian Pacific Railways», which was recorded in regulatory intergovernmental documents. Particular attention is paid to the Canadian emigration policy, when the «railway agreements» were periodically suspended by the Canadian authorities. Restrictions on the possibilities of agreements limited the possibility of resettlement in the dominion.

**Keywords:** Belarusian emigration, Belarusian diaspora, Canada, legal adaptation, Polish immigration policy.

**For citation:** Koval V. U. Legal aspects of the Belarusian emigration to Canada (1921–1939). *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2023, no. 1 (269), pp. 91–94 (In Belarusian). DOI: 10.52065/2520-6885-2023-269-1-16.

**Уводзіны.** У міжваенны перыяд Канада стала адным з галоўных цэнтраў беларускай міжкантынентальнай эміграцыі. У тэме даследавання перасяленчых працэсаў у дамініён застаецца шмат нявывучаных пытанняў і фактаў. Асобныя аспекты праблемы ў сваіх работах раскрывалі польскія гісторыкі. Пераважную частку эміграцыйнай хвалі беларусаў у Канаду склалі жыхары Заходняй Беларусі, якая з 1921 г. па 1939 г. уваходзіла ў склад Другой Рэчы Паспалітай. Даследаванне прававых аспектаў эміграцыйных працэсаў дазваляе ўзважана ацаніць палітычныя і эканамічныя мэты дзяржаўнай палітыкі прымаючага грамадства, патлумачыць выбар эмігрантаў, раскрыць складанасці адаптацыйных працэсаў.

**Асноўная частка.** Канадскі ўрад заўсёды пільна кантраляваў рэкрутацыю эмігрантаў, падзяляючы іх на «прыярытэтных» і «непрыярытэтных». З 1920-х гг. была ўведзена практыка шырокай падтрымкі перасяленцаў, што было адлюстравана ў канадскім эміграцыйным заканадаўстве [1, с. 6]. Для «прыярытэтных» груп эмігрантаў ствараліся льготныя ўмовы перасялення, афармляліся спецыяльныя крэдытныя праграмы для выплат асноўных сум за зямельны надзел. Улады дамініёна лічылі прыярытэтнымі для перасялення грамадзян Вялікабрытаніі, Францыі, Бельгіі і г. д.

Маштабы беларускай эміграцыйнай хвалі ў Канаду складана ацаніць дакладна, бо жыхары Заходняй Беларусі мелі польскі замежны пашпарт

і вымушаны былі афармляць канадскую візу. Прыблізная колькасць беларускіх эмігрантаў у міжваенны перыяд склала каля 11 000, калі за асноўную гістарычную крыніцу ўзяць дакументы польскай статыстыкі [2, л. 140], у якіх аналізуюцца лічбы перасяленцаў у дамініён з Беластоцкага, Віленскага, Палескага і Навагрудскага ваяводстваў.

Пікавыя лічбы эміграцыі ў Канаду польская статыстыка зафіксавала з 1926 па 1931 г., калі з усёй тэрыторыі Другой Рэчы Паспалітай выехала 35 400 чалавек і ў 1937–1938 гг., калі колькасць усіх эмігрантаў склала 10 200 чалавек [2, л. 139]. Патлумачыць спрыяльную кан'юнктуру для эміграцыі можна ў першую чаргу палітыкай дзяржавы-рэцыпіента. З 1926 г. пачалі дзейнічаць новыя заканадаўчыя акты («чыгуначныя пагадненні»), якія спрашчалі працэс афармлення перасялення ў дамініён. З 1926 г. канадскія кампаніі ў Польшчы разгарнулі шырокую агітацыю і пачалі рэкрутацыю эмігрантаў. Сусветны эканамічны крызіс вымусіў улады прыпыніць пашырэнне маштабаў эміграцыі. Другі пік тлумачыцца эканамічным напружаннем перадваенных гадоў і імклівым развіццём індустрыяльных раёнаў Канады, куды таксама накіроўвалі эмігрантаў.

Заканадаўства дзяржавы-рэцыпіента заўсёды было добрым механізмам як для стрымлівання эміграцыйных працэсаў, так і для пашырэння агульнай эміграцыйнай хвалі. У сярэдзіне 1920-х гг. канадскі ўрад палічыў, што недахоп сельскагаспадарчых рабочых прасцей за ўсё кампенсаваць эмігрантамі. 15 лістапада 1925 г. урад Канады падпісаў пагадненні з канадскімі чыгуначнымі кампаніямі «Canadian National Railways» (CNR) і «Canadian Pacific Railways» (CPR) аб дазволе рэкрутацыі эмігрантаў з Еўропы [3, с. 163]. Дакументы пашыралі магчымасці арганізацыі эміграцыі з ліку «непрыярытэтных» краін, што дазваляла праводзіць шырокую працу ў Польшчы.

Канадскія чыгуначныя кампаніі валодалі значнымі надзеламі зямлі ўздоўж чыгуначнага палатна, таму яны адразу ж прапаноўвалі эмігрантам набыць пэўныя сельскагаспадарчыя ўгоддзі. Рэклама прыносіла значныя прыбыткі, паспяховыя агенты за сваю выніковую працу маглі разлічваць на прэміраванне. Сярэдняя ўзнагарода за кожных 50 чалавек, накіраваных у дамініён, складала 150 амерыканскіх долараў, альбо даравалася бясплатная карабельная карта ў Канаду (з бясплатным зваротным квітком) [3, с. 164]. Эканамічнае стымуляванне агентаў давала добрыя вынікі, яны рабілі такую рэкламу жыцця ў Канадзе, што колькасць жадаючых эміграваць у 2–3 разы была большай за рэальныя магчымасці працадаўцаў.

Наступным крокам легалізацыі эканамічнай эміграцыйнай хвалі сталі юрыдычныя акты, распрацаваныя ўрадамі Канады і Польшчы. У сакавіку 1926 г. былі падпісаны міжурадавыя «чыгуначныя пагадненні» аб рэкрутацыі эмігрантаў, што абумовіла пачатак масавай эміграцыі з Другой Рэчы Паспалітай у Канаду [4, с. 138]. Дадатковым фактарам, які аказваў уплыў на пашырэнне маштабаў перасялення ў дамініён, сталі эміграцыйныя квоты, уведзеныя ў ЗША, якія значна абмяжавалі магчымасці эміграцыі ў Злучаныя Штаты Амерыкі. Некаторыя беларусы разглядалі Канаду патэнцыяльнай краінай Паўночнай Амерыкі, якая пашырала магчымасці ўезду у ЗША, абыходзячы ўсталяваныя квоты для польскіх грамадзян.

Як ужо адзначалася, асноўнымі канадскімі кампаніямі сталі чыгуначныя прадстаўніцтвы «Canadian National Railways» і «Canadian Pacific Railways». Дзяржаўныя канадскія органы пераклалі асноўную адказнасць за адбор эмігрантаў на буйныя камерцыйныя арганізацыі. З боку польскіх дзяржаўных органаў асноўны кантроль за рэкрутацыяй эмігрантаў быў ускладзены на Эміграцыйнае ўпраўленне, якое мела разгалінаваную сетку экспазітур.

Канадскія ўлады пакідалі за сабой права прыпыняць дзейнасць «чыгуначных пагадненняў», што нярэдка прыводзіла да банкруцтва сем'яў эмігрантаў, якія прадавалі ўсю сваю маёмасць і чакалі дазолу на выезд. Абавязковай умовай перасялення ў дамініён была акрэсленая сума грошай, якую называлі «landing money». Памеры сумы для сем'яў у розныя гады складалі ад 350 да 500 канадскіх долараў і 25–38 канадскіх долараў для індывідуальных эмігрантаў [4, с. 138]. Газета «Беларуская крыніца» размясціла матэрыял пра крытычную сітуацыю прыпынення «чыгуначных пагадненняў»: «У першых днях марта ўрадовыя бюры пасрэдніцтва працы будуць прымаць заявы кандыдатаў на выезд у Канаду. У першую чаргу будуць магчы выехаць тыя, якія ў мінулым годзе атрымалі дазвол на выезд, але не выехалі дзеля ўтрымання эміграцыі. Кожны эмігрант павінен мець на дарогу 185 даляраў» [5, с. 3]. Абвестка пазначала канкрэтную суму 185 канадскіх долараў у 1934 г. («landing money»), якую эмігрантам неабходна было прад'явіць пры перасяленні ў Канаду. Мінімальныя сумы мяняліся ў розныя гады, бо значная частка сялян проста іх не паспявала сабраць.

Працэдура афармлення дакументаў на выезд у Канаду для беларускіх сялян была складанай, што стварала ўмовы для шматлікіх ашуканстваў. З пашырэннем маштабаў эміграцыі міністэрства фінансаў Польшчы ў 1925 г. прыняло рашэнне выдаваць бясплатныя замежныя пашпарты [6, с. 110], якія можна было атрымаць толькі з дазволу Эміграцыйнага ўпраўлення ў выпадку перасялення ў Канаду. Для запаўлення бланкаў

на пашпарт грамадзяне прадстаўлялі свае фотаздымкі. У замежны пашпарт кожны эмігрант павінен быў атрымаць канадскую візу, яе выдавалі толькі тым асобам, якія змаглі пераканаць чыноўнікаў у гарантаванай дапамозе з боку сям'і ці занаёмых у выпадку складанай матэрыяльнай сітуацыі.

Аналізам маштабаў эміграцыйных патокаў у Другой Рэчы Паспалітай займаліся міністэрства замежных спраў і міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Урад Польшчы 1 красавіка 1920 г. прыняў рашэнне стварыць асобнае Эміграцыйнае упраўленне пры міністэрстве працы і сацыяльнай абароны [7, с. 47]. На новы дзяржаўны орган былі ўскладзены абавязкі распрацоўкі закандаўчых эміграцыйных актаў. Задачамі ўпраўлення было інфармаванне грамадства пра ўмовы эміграцыі, падтрымка перасяленцаў у працэсе іх праўавой і сацыяльнай адаптацыі, выяўленне спрыяльнай кан'юнктуры для эміграцыі. Значную ўвагу польскі дзяржаўны апарат надаваў пытанням рээміграцыі, хаця ў выпадках міжкантынентальнай эміграцыйнай хвалі падобныя меры не заўсёды былі эфектыўнымі.

З пашырэннем маштабаў перасялення ў сярэдзіне 1920-х гг. узнікла патрэба ў праграмах дзяржаўнай крэдытнай падтрымкі для эмігрантаў і іх сем'яў, а таксама ў юрыдычнай дапамозе пры афармленні дакументаў. Сусветны эканамічны крызіс вымусіў польскі ўрад стварыць Эміграцыйны сіндыкат. Таварыства з абмежаванай адказнасцю было арганізавана ў студзені 1930 г. з устаўным капіталам 858 тыс. злотых (600 тыс. злотых былі дзяржаўным капіталам, а астатнія грошы ў сіндыкат уклалі карабельныя лініі) [7, с. 49]. Праз Эміграцыйны сіндыкат дзяржаўныя структуры намагаліся кантраляваць прыбыткі замежных кампаній ад продажу карабельных квіткоў. Для ўрада было важна спыніць нелегальную рэкрутацыю, якую праводзілі замежныя карабельныя лініі. Адной з асноўных крыніц прыбыткаў таварыства сталі выплаты замежных кампаній за арганізацыю эміграцыі для кожнай асобы, бо сіндыкат дапамагаў у афармленні візы, транспарту багажу, набыцці карабельных карт і г. д.

У 1930-я гг. частка функцый Эміграцыйнага ўпраўлення была перададзена Эміграцыйнаму сіндыкату, які больш паспяхова кантраляваў нелегальныя схемы і ашуканствы эмігрантаў. Сіндыкат аказваў дапамогу ў рэкрутацыі асоб, арганізацыі падарожжа, інфармаваў насельніцтва пра магчымасці замежных заробкаў.

Працэс першапачатковай адаптацыі эмігрантаў у Канадзе быў звязаны з пэўнымі абавязкамі перад суайчыннікамі, бо ў калоніях дзейнічалі цэлыя праграмы ўзаемадапамогі. Эмігрантамі збіраліся пэўныя сумы для новых членаў калоніі для разбудовы гаспадаркі і падтрымкі ў першыя месяцы жыцця за мяжой.

Польскія дзяржаўныя органы пільна кантралявалі эміграцыйныя працэсы, якія лічылі добрым механізмам для вырашэння праблемы нацыянальных меншасцей, таму праз стымуляцыю эміграцыі няпольскіх элементаў імкнуліся да апалячвання «крэсаў усходніх». Адбывалася мэтанакіраваная інтэнсіфікацыя міжкантынентальнай эміграцыі ў ваяводствах Заходняй Беларусі, што дазваляла паменшыць колькасць аўтэхтоннага насельніцтва. Разам з тым улады абмяжоўвалі сезонную еўрапейскую эміграцыю беларусаў, каб знізіць канкурэнцыю для палякаў і даць магчымасць сялянам на этнічна польскіх тэрыторыях зарабіць грошай за мяжой. З мэтай кантролю за эміграцыйнымі працэсамі была ўведзена забарона для замежных прадстаўніцтваў на агітацыйную дзейнасць. Выключэнне ў агітацыйна-прапагандысцкай рабоце зрабілі для адзінкавых замежных прадстаўніцтваў, сярод якіх былі канадскія чыгуначныя кампаніі «Canadian National Railways» і «Canadian Pacific Railways» [8, с. 345]. У перанаселеных і беззямельных беларускіх вёсках такая агітацыя часам стварала «ліхаманкавую» рэакцыю моладзі.

Сельскагаспадарчыя работнікі ў Канадзе па ўзросце былі дастаткова маладымі людзьмі. Юрыдычна быў замацаваны цэнз узросту для галавы сям'і, на заканадаўчым узроўні было прапісана, што гаспадар не павінен быць старэйшым за 50 гадоў [9, с. 51]. Адмежаванні ўзросту стваралі ўмовы дзейнасці і развіцця сельскагаспадарчай калоніі, дзе працавалі асобы прыблізна аднаго пакалення. Жанчыны ў прэцэсе афармлення дакументаў на візу павінны былі прадставіць пасведчанне аб маральнасці, а мужчыны – ваенны білет. Выбіраліся асобы прыблізна аднолькавай кваліфікацыі з пэўным узроўнем выхавання, што дапамагала эмігрантам у працэсе сацыяльна-псіхалагічнай адаптацыі.

**Заключэнне.** Такім чынам, польская дзяржаўная палітыка інтэнсіфікацыі міжкантынентальнай эміграцыі беларускага насельніцтва павінна была спрыяць працэсу паланізацыі ў Заходняй Беларусі. Рэкрутацыя эмігрантаў у беларускіх ваяводствах Польшчы праводзілася на аснове «чыгучачных пагадненяў» камерцыйнымі прадстаўніцтвамі канадскіх кампаній «Canadian National Railways» і «Canadian Pacific Railways». У працэсе адбору эмігрантаў улічваўся стан здароўя, кваліфікацыя, выхаванне, узрост асоб.

## Спіс літаратуры

1. Reczyńska A. Soroka T. Polska emigracja do Kanady na przełomie wieków XX i XXI w kontekście kanadyjskiej polityki imigracyjnej // Studia Migracyjne. 2013. Vol. 38. S. 5–18.

2. Archiwum Akt Nowych (AAN) w Warszawe. Zespól Ministerstwa Spraw Zewnętrznych. Sygn. 9886. S. 139–140.

3. Дзира О. Друга хвиля еміграції українців до Канади: причини, характер и склад // Міжнародні зв'язки України: наукові пошуки і знахідки. 2015. Вип. 24. С. 157–175.

4. Brożek A. Polityka imigracyjna w państwach docelowych emigracji polskiej (1850–1939) // Emigracja z ziem polskich w czasach nowożytnych i najnowszuch (XVIII–XX w.). Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1984. S. 120–140.

5. Emihracyja ŭ Kanadu // Biełaruskaja Krynica. 1934. № 18. C. 3.

6. Reczyńska A. Emigracja z Polski do Kanady w okresie międzywojennym. Wrocław [etc.]: Wydawnictwo Polskiej Akademii Nauk, 1986. 223 s.

7. Łazor J. Polityka migracyjna Drugiej Rzeczypospolitej – próba syntezy. Warszawa, 2015. URL: http://hdl.handle.net/20.500.12182/578 (дата звароту: 02.03.2023).

8. Janowska H. Emigracja z Polski w latach 1918–1939 // Emigracja z ziem polskich w czasach nowożytnych i najnowszych (XVIII–XX w.). Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1984. S. 326–450.

9. Matejka J. Kanadyjska polityka immigracyjna w stosunku do Polaków w latach 1896–1939 // Studia Poloijne. 1979. T. 3. S. 23–60.

## References

1. Rechynska A. Soroka T. Polish emigration to Canada at the turn of the XX and XXI centuries in the context of Canadian immigration police. *Studia Migracyjne* [Migration Studies], 2013, no. 38, pp. 5–18 (In Polish).

2. Archives of Modern Records in Warsaw. Fund of the Ministry of Foreing Affairs. I. 9886. L. 139–140.

3. Dzira O. The second wave of emigration of the Ukrainians to Canada: causes, features, composition. *Mizhnarodni zvyazky Ukrainy; naukovi poshuki i znakhidki* [Internationa relations of Ukraine: scientific searches and discoveries], 2015, no. 24, pp. 157–175 (In Ukrainian).

4. Brozek A. The immigrational policy in the target countries of Polish emigration (1850–1939). *Emigracja z ziem polskich w czasach nowożytnych i najnowszuch (XVIII–XX w.)* [The emigration from Polish territories during the modern and contemporary times (since 18th century until 20th century). Warsaw, Państwowe Wydawnictwo Naukowe Publ., 1984, pp. 120–140 (In Polish).

5. Emigration to Canada. *Belaruskaya Krynitsa* [The Belarusian Source], 1934, no. 18, p. 3 (In Belarusian).

6. Rechynska A. *Emigracja z Polski do Kanady w okresie międzywojennym* [The emigration from Poland to Canada during the interwar period]. Wroclaw [etc.], Wydawnictwo Polskiej Akademii Nauk Publ., 1986. 223 p. (In Polish).

7. Lazor J. Emigration policy of Second Polish-Lithuanian Commonwealth – synthesis attempt. Warsaw, 2015. Available at: http://hdl.handle.net/20.500.12182/578 (accessed 02.03.2023) (In Polish).

8. Janowska H. Emigration from Poland in the years 1918–1939. *Emigracja z ziem polskich w czasach nowożytnych i najnowszych (XVIII–XX w.)* [The emigration from Polish territories during the modern and contemporary times (since 18th century until 20th century)]. Warsaw, Państwowe Wydawnictwo Naukowe Publ., 1984. pp. 326–450 (In Polish).

9. Matejka J. Canadian immigration policy towards the Polish in 1896–1939. *Studia Polonijne* [Polish Studies], 1979, vol. 3, pp. 23–60 (In Polish).

## Інфармацыя пра аўтара

**Коваль Вольга Уладзіміраўна** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: koval@belstu.by

## Information about the author

**Koval Volha Uladzimirauna** – PhD (History), Associate Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., Minsk, Republic of Belarus). E-mail: koval@belstu.by

*Паступіў 13.03.2023*